Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 3. Варыянт 6.2**

**Білет №3. Практычнае заданне. Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь**

**Заданні склала:** настаўнік гімназіі №27 Елісеенка Вольга Аляксандраўна

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**

1. На аснове крыніцы 1 вызначыце знешнепалітычны працэс, удзельнікам якога з'яўляецца Рэспубліка Беларусь
2. На аснове крыніцы 1 вылучыце асноўныя этапы інтэграцыі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі
3. На аснове крыніцы 2 зрабіце вывад аб падтрымцы інтэграцыйных працэсаў грамадзянамі Рэспублікі Беларусь
4. З дапамогай крыніцы 3 зрабіце вывад аб значэнні інтэграцыі для эканомікі Рэспублікі Беларусь

**Крыніца 1.**

Дагавор паміж РФ і Рэспублікай Беларусь ад 08.12.1999 "Аб стварэнні Саюзнай дзяржавы"

Расійская Федэрацыя і Рэспубліка Беларусь,

кіруючыся воляй народаў Расіі і Беларусі да яднання і абапіраючыся на агульнасць іх гістарычных лёсаў, клапоцячыся аб жыццёвых інтарэсах сваіх грамадзян;

перакананыя ў тым, што ўтварэнне Саюзнай дзяржавы дасць магчымасць аб'яднаць намаганні ў інтарэсах сацыяльнага і эканамічнага прагрэсу абедзвюх дзяржаў;

рухомыя імкненнем прадоўжыць развіццё інтэграцыйных працэсаў, закладзеных Дагаворам аб стварэнні Супольнасці Расіі і Беларусі ад 2 красавіка 1996 года, Дагаворам аб Саюзе Беларусі і Расіі ад 2 красавіка 1997 года, Статутам Саюза Беларусі і Расіі ад 23 мая 1997 года, а таксама рэалізуючы пастановы далейшым яднанні Расіі і Беларусі ад 25 снежня 1998 года;...

дамовіліся аб наступным:

...Артыкул 1

Расійская Федэрацыя і Рэспубліка Беларусь (далей - дзяржавы - удзельніцы) ствараюць Саюзную дзяржаву, якая азначае сабой новы этап у працэсе яднання народаў дзвюх краін у дэмакратычную прававую дзяржаву...

стварэнне адзінай эканамічнай прасторы для забеспячэння сацыяльна - эканамічнага развіцця на аснове аб'яднання матэрыяльнага і інтэлектуальнага патэнцыялаў дзяржаў - удзельніц і выкарыстання рыначных механізмаў функцыянавання эканомікі;...

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Крыніца 2**

**Вынікі рэферэндуму 14.05.1996:**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | За наданне рускай мове роўнага статусу з беларускай | 83,3% |
| 2 | За змену дзяржаўных сімвалаў | 75,1% |
| 3 | За інтэграцыю з Расіяй | 83,3% |
| 4 | За права Прэзідэнта распускаць Вярхоўны Савет | 77,7% |

**Крыніца 3.**




